Юлія Лук'янюк
Беларускі дзяржаўны універсітэт

ГЕНЕТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Асноўнай крыніцай фарміравання беларускай філасофскай тэрміналагічнай сістэмы з'явіліся лексічныя і словаўтваральныя сродкі нацыянальнай мовы. Узбагачэнне філасофскай тэрміналогіі сродкамі ўласнага лексічнага фонду адбывалася наступнымі шляхамі:

1. Выкарыстанне агульнаўжывальнай лексікі. Такія тэрміны, *як выпадковасць*, *вынік*, *асоба*, *дабро* і інш. былі ўтвораны шляхам спецыялі-

зацыі значэння семантыкі агульнаўжывальнага слова. Частка філасофскіх тэрмінаў узнікла ў выніку звужэння значэння: *“я”*, *мера, змест* і інш.

Уласнабеларускія тэрміналагічныя адзінкі, зафіксаваныя ў часопісах, энцыклапедычных і тлумачальных слоўніках беларускай літаратурнай мовы, дакладна выражаюць сутнасць філасофскіх паняццяў.

2. Стварэнне неалагізмаў на аснове запазычаных і ўласнабеларускіх афіксальных марфем (*су*/свет, *су*свет/нік, азнач/*энн*/е, вымяр/*энн*/е, бы/*цц*/ё, пачу/*цц*/ё). Частка тэрмінаў-неалагізмаў была ўтворана шляхам калькавання адпаведных тэрмінаў з рускай мовы (*богоискательство – богашукальніцтва*, *надстройка – надбудова*, *мировоззрение – светапогляд*).

3. У беларускай філасофскай тэрміналогіі значную колькасць складаюць састаўныя найменні, у якасці ядзернага кампанента якіх з’яўляецца ўласнамоўны тэрмін. Так тэрмін *адзінства* стаў ядром наступных тэрміналагічных спалучэнняў: *субстанцыянальнае адзінства, атрыбутыўнае адзінства, генетычнае адзінства.* Тэрмін *адносіны* – ядзерны кампанент у наступных тэрмінаспалучэннях: *грамадскія адносіны, палітычныя адносіны, прававыя адносіны.* У спалучэннях *абсалютны рух, адносны рух* – тэрмін рух.

4. Запазычанне тэрміналагічных адзінак з іншых моў. У колькасных адносінах значную частку (35,9 %) складаюць тэрміны лацінскага (*аналіз, сінтэз, анархізм, анталогія, антрапалагізм, антытэзіс, атараксія, геацэнтрызм, геліяцэнтрызм*, *эўдэманізм*) і грэчаскага (*абсалют, дэдукцыя, рэалізм, рэлятывізм, тамізм, універсум, экзістэнцыя)* паходжанняў.

Запазычанні з заходнееўрапейскіх моў пераважна складаюць галіцызмы (*аптымізм, ідэал, ідэалізм, казуістыка, манізм, песімізм, аптымізм*) і германізмы (*натурфілософія*, *махізм*, *гегельянства*, *кантыянства*). У асноўным галіцызмы паходзяць з грэчаскіх ці лацінскіх каранёў.

У складзе беларускай філасофскай тэрміналогіі непасрэдныя запазычанні з рускай мовы складаюць 3,2 %: *ісціна, мысль, мысліцель, мысліць, канечнае, канкрэтнае, класавая барацьба, ленінізм, рабочы клас, распрадмечванне, талстоўства* і інш.

Сярод простых (аднаслоўных) тэрмінаў уласныя і запазычаныя прадстаўлены амаль у роўнай колькасці (24,6 % : 24,4 %). У складзе тэрмінаўкампазітаў 69 уласнамоўных і 132 запазычаныя тэрміны. Сярод шматкампанентных пераважаюць тэрміны з запазычанымі ядзернымі кампанентамі інтэрнацыянальнага характару. Праведзены аналіз дае падставы сцвярджаць, што беларуская філасофская тэрміналогія, як і тэрміналогіі іншых

усходнеславянскіх і заходнееўрапейскіх моў, у значнай сваёй частцы ўзыходзіць да крыніц грэчаскага і лацінскага паходжання (35,9 % тэрмінаў маюць грэчаскую і лацінскую аснову).

Генетычную характарыстыку філасофскіх тэрмінаў можна падаць у выглядзе табліцы:

Крыніцы	Тэрміны, агульная колькасць	Простыя		Тэрміны-кампазіты, %	Шматкампанентныя	
		Свая-моўныя, %	Запазычаныя, %		з уласна-моўным ЯК, %	з запазычаным ЯК, %
БелСЭ	217	43,8	39,2	2,8	5,5	8,7
БелЭн	283	38,8	33,2	11	8,5	8,5
ТСБМ	286	41,9	42,7	12,2	0,3	2,8
ТСБЛМ-96	299	46,2	49,2	3,6	–	1
Тэрміналагічна-тлумачальны слоўнік па філасофіі (ТСФ)	821	28,7	43,4	4,8	11,2	11,9
Асновы філасофіі	614	20,8	15,3	2,6	40,9	20,4
Філасофія: курс лекцый	426	25,5	12	2,3	24,1	36,1
Першацвет	60	46,7	48,3	–	3,3	1,6
КТСФ (слоўнік па філасофіі)	108	38,9	43,5	5,6	6,5	5,6
Чалавек і грамадства	139	41,0	41,7	8,6	5,04	3,6
Русско-белорусский общественно-политич. словарь	1770	5,5	8,7	1,7	26,8	57,3